*А. С. Матузенка, магістрант БДУКМ*
*Навуковы кіраўнік – Л. І. Казлоўская,*
*кандыдат педагагічных навук, дацэнт,*
*загадчык кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці БДУКМ*

# ДАЛУЧЭННЕ СЯМ'І ДА НАЦЫЯНАЛЬНАЙ СПАДЧЫНЫ СРОДКАМІ БЕЛАРУСКАГА ТКАЦТВА

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

Выхаванне сям'і праз народнае мастацкае – ткацтва вельмі цікавая старонка беларускай культуры. Сям'я – найважнейшы сацыяльны інстытут, у рамках якога грамадства прайграве сябе, і у той жа час сацыяльна-псіхалагічнае і маральнае мікраасяродзе, дзе ажыццяўляецца першасная сацыялізацыя чалавека, дзе адбываецца (або не адбываецца) адаптацыя людзей да новых умоў жыцця [5, с. 81]. Сям'я заклікана выконваць выключную ролю ў жыцці грамадства, яго стабілізацыі, пераадоленні сацыяльнай напружанасці, сцвярджэнні маральных асноў у грамадстве, сацыялізацыі дзяцей, развіцці культуры і эканомікі.

Па статыстыцы на 10 шлюбаў у цяперашні час прыходзіцца 4–5 разводаў. Гэта азначае, што прыблізна кожная другая пара не вытрымлівае «выпрабаванне шлюбам». Калі мы разгледзім агульныя каэфіцыенты шлюбнасці і разводаў па абласцях і г. Мінску ў 2013 г. па дадзеных Нацыянальнага статыстычнага камітэту Рэспублікі Беларусь, то яны будуць наступныя: каля 4% шлюбаў не вытрымліваюць і аднаго года; каля 15% – не больш двух гадоў сумеснага жыцця; парадку 20% сем'яў падаюць на развод, пражыўшы тры-чатыры гады разам; дзесяцігадовую мяжу пераадольваюць каля 30%, а шанцы дацягнуць да срэбнага вяселля застаюцца ў 31%. Гэтая праблема, якая стаіць перад сучасным грамадствам, патрабуе рашэння.

Сям'я, з'яўляючыся натуральнай і асноўнай ячэйкай грамадства, знаходзіцца пад абаронай дзяржавы. Дзяржава праяўляе клопат аб сям'і шляхам стварэння ўмоў для эканамічнай самастойнасці і росту дабрабыту сям'і, ільготнай палітыкі, выплаты дзяржаўных дапамог сем'ям. Выхаванне дзяцей і вядзенне хатняй гаспадаркі прызнаецца грамадска карыснай працай. У сферы сацыяльнай палітыкі дзяржава лічыць прыярытэтнай задачай абарону шлюбу, сям'і, ахову мацярынства, бацькоўства і дзяцінства. У Кодэксе Рэспублікі Беларусь аб шлюбе і сям'і

пастаўлены наступныя прыярытэты: умацаванне сям'і як натуральнай і асноўнай ячэйкі грамадства на прынцыпах агульначалавечай маралі, недапушчэнне паслаблення і парушэння сямейных сувязяў; пабудова сямейных адносін на добраахвотным шлюбным саюзе жанчыны і мужчыны, роўнасці правоў мужа і жонкі ў сям'і, на ўзаемнай любові, павазе і ўзаемадапамозе ўсіх членаў сям'і; устанаўленне правоў дзяцей і забеспячэнне іх прыярытэту ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам; устанаўленне правоў і абавязкаў мужа і жонкі, бацькоў і іншых членаў сям'і ў адпаведнасці з палажэннямі Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, нормамі міжнароднага права; ахова мацярынства і бацькоўства, правоў і законных інтарэсаў дзяцей, забеспячэнне спрыяльных умоў для развіцця і станаўлення кожнага дзіцяці. 28 кастрычніка 2013 г. у Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб шлюбе і сям'і былі ўнесены значныя змяненні і дапаўненні. Асаблівая ўвага сям'і і сямейным адносінам удзяляецца ў дзяржаўным дакуменце Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 21 студзеня 1998 г. № 46 «Аб зацвярджэнні асноўных напрамкаў дзяржаўнай сямейнай палітыкі Рэспублікі Беларусь».

«Народнае мастацкае ткацтва – адзін з найбольш папулярных і пашыраных відаў народнага мастацтва. Між тым яно яшчэ слаба вывучана. Мы звыкла ацэньваем тканыя рэчы з пазіцыі прыгажосці, адмысловасці арнаментыкі, гармоніі каларыту. Але народнае мастацкае ткацтва – бяздонная крыніца культурнагістарычных звестак, якія таксама можна выкарыстоўваць у фарміраванні сямейных адносін. Што ні ўзор – то сімвал. Сімвалаў у беларускім мастацкім ткацтве вельмі шмат і кожны з іх нясе ў сабе вялікае значэнне. Сімвалы ўраджаю: Спарыш, Рай, Багач – вучаць любіць маці-зямлю, працу, дабівацца добрага ўраджаю. Сімвалы свят: Купала, Каляда, Масленіца, Вялікдзень, якія даруюць радасць, весялосць, гонар за вынікі сялянскай працы. Сімвалы памяці: Дзяды, Радаўніца, нясуць у сабе любоў і павагу да продкаў. Усё, што захавана ў народным ткацтве, не пералічыць, але кожны ўзор сімвалізуе дабро, праўду, прыгажосць, любоў, гонар за чалавека і яго працу – такія важныя паняцці для сямейнага выхавання» [3].

«Узоры тканых і вышываных вырабаў – зашыфраваны аповед пра жыццё народа, прыроду, людзей» [3]. Кажучы іншымі словамі, мастацкае ткацтва – гэта народная педагогіка беларусаў. Каб выхаваць чалавека, добрага сем'яніна, трэба абавязкова па-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

знаёміць сучасную моладзь з нацыянальным багаццем і ў яркай вобразнай форме паказаць яго лепшыя ўзоры.

У мастацкім ткацтве значнасць сям'і і добрых сямейных адносін беларусаў перададзена праз вобразы жыцця, маці, чалавека, сям'і, дзяржавы, кахання. Зараз разгледзім кожны вобраз больш падрабязней і вылучым іх асаблівасці ў выхаванні сям'і.

Як сімвал любові і міласэрнасці ў дэкоры тканых і вышываных вырабаў вельмі часты вобраз маці. У яго аснове – васьміканцовая зорка, што абазначае чалавека, асобу. Аблямоўвае яе гірлянда з кветак, што падкрэслівае веліч маці, яе асаблівую ролю ва ўзнаўленні і прадаўжэнні жыцця. Звычайна зорка суправаджаецца чатырма крыжыкамі – пажаданнямі дабра і шчасця. Добра вядомы ў хрысціянскім мастацтве вобраз Аранты – Маці-Багіні з узнятымі рукамі. У тканых і вышываных вырабах народных майстрых ён досыць умоўны, схематызаваны, але па-свойму ўрачысты і манументальны. Найвышэйшае ўвасабленне любові, дабрыні і прыгажосці – вобраз маці з дзіцём, якім натхняліся мастакі і майстры ўсіх часоў і народаў. Не маглі не звярнуцца да гэтага вобразу і беларускія ткачыхі і вышывальшчыцы. На тканых вырабах у розных кутах Беларусі і за яе межамі можна бачыць вядомы ўзор зоркі, змешчанай у падобную зорку большага памеру, а потым – у васьмівугольную аблямоўку. Ткачыхі называюць гэты матыў сімвалам роднай маці, што ўвасабляе самую вялікую і бескарыслівую любоў, якая толькі можа быць на свеце. Акрамя маці-жанчыны ў народным ткацтве пашыраны яшчэ адзін вобраз маці – Вялікай багіні Маці-Зямлі. Яго асноўныя варыянты: багіня Маці-Зямля ў зорах (на небе), у сонцы (з сонцам) і Маці-Зямля-Карміцелька (ніва).

Вельмі цікавымі ў беларускім мастацкім ткацтве з'яўляюцца вобразы кахання, якое, відаць, узнікла разам з чалавекам. Гэтае высокае духоўнае пачуццё здавён ставіла канчатковай мэтай стварэнне сям'і, выхаванне дзяцей, вядзенне сумеснай гаспадаркі. Галоўны сімвал кахання – Лада. Яна ў славян і літоўцаў шанавалася як апякунка кахання і шлюбаў, багіня юнацтва, прыгажосці і пладавітасці. Часцей за ўсё Лада паказана ў выглядзе маладой дзяўчыны, нярэдка суправаджаецца ружамі і галубкамі, якія сімвалізуюць прыгажосць і каханне. Трагічнае, нераздзельнае каханне дзяўчыны апета ў мастацкай творчасці многіх народаў Еўропы і звязваецца звычайна з вобразамі русалкі. Сімвалам жанчыны ў горы, смутку, жальбе ці ўдавы, якая аплаквала роднага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чалавека, быў вобраз зязюлі. Голуб і галубка самыя папулярныя сімвалы кахання. Як лічыцца ў народзе, голуб азначае дзецюка, а галубка – дзяўчыну, а разам яны сімвалізуюць любоў дзяўчыны і хлопца. Ружа як сімвал прыгажосці і кахання, зара-зарніца і вянок таксама ярка малююць каханне ў беларускім ткацтве.

Трэба адзначыць вялікую папулярнасць у народнай мастацкай творчасці вобразаў чалавека і сям'і. Сімвал чалавека – васьміканцовая зорка. Як правіла, зорку аблямоўваюць кветкавай гірляндай ці падобным арнаментальным матывам геаметрычнага характару, што, пэўна, падкрэслівае веліч і прыгажосць чалавека. Вобразы мужчыны і жанчыны мелі вельмі значны сэнс у беларускіх ручніках. Толькі людзей прырода надзяліла пачуццём кахання. І гэты прыродны дар нашы продкі заўсёды шанавалі. Адносіны мужчыны і жанчыны заўсёды акружаліся арэолам святасці, лічыліся асноваю трывалай, здаровай сям'і. Возьмем традыцыйныя вясельныя абрады, якія ўслаўлялі і замацоўвалі стварэнне новай сям'і. Выпечка каравая ператваралася ў сапраўднае рытуальнае дзеянне, у якім ухваляліся цнатлівасць нявесты, яе прыгажосць, працавітасць, гаспадарлівасць. Сэнс песень, што суправаджалі выпечку каравая, і фігурныя аздобы на ім нярэдка мелі, як мы сёння сказалі б, эратычную афарбоўку, але ўсё гэта мела здаровы, разумны сэнс – захаванне чысціні роду, стварэнне здаровай сям'і. Гэты ж сэнс укладваўся і ў абрад першай шлюбнай ночы. Такой жа святасцю и маральнай чысцінёй прасякнуты ўзоры, якія абазначаюць адносіны мужчыны і жанчыны. Выгляд і кампазіцыя гэтых узораў розныя, і ўсе яны, як сведчылі майстрыхі, маюць розныя значэнні.

Кожная цывілізаваная краіна заклапочана ўмацаваннем сям'і. Гэта той падмурак, на якім трымаецца дзяржава. Малюнкі на ручніках з вобразам сям'і вельмі разнастайныя, але блізкія па кампазіцыі. Звычайна гэта чатыры крыжападобна спалучаныя разеткі, нярэдка ў арнаментальнай абмалёўцы. Ручнікі на гэтую тэму часта вызначаюцца вельмі багатай кампазіцыяй, якая складаецца не толькі з ужо згаданага канкрэтнага матыву, але дапаўняецца і іншымі, блізкімі па сэнсе сімваламі маці, зоркі, дзіцяці і інш. Звычайна такія ручнікі ахвяраваліся ў царкву, на абраз Маці Божай.

За многія стагоддзі традыцыйная арнаментыка ўвабрала жыццёвую мудрасць народа, яго надзеі і мары, гора і радасць. Яе кампазіцыя ясная і дакладная, малюнак лаканічны і выразны, кала-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рыстыка стрыманая і высакародная. Кожны ўзор нясе ў сабе той ці іншы сэнс, выяўляе пэўную ідэю. Адны ўзоры сімвалізуюць памяць аб продках, другія выказваюць зварот да багоў-заступнікаў, трэція ўвасабляюць прыродныя з’явы, чацвёртыя адлюстроўваюць пачуцці і надзеі чалавека. Усе гэтыя сімвалы спалучаюцца ў вобразе жыцця, які часта выкарыстоўваюць беларускія майстрыхі ў сваіх ручніках.

Такім чынам, глыбокі сэнс закладзены быццам бы ў простыя ўзоры, якія можна чытаць, як кнігу, глядзець, як спектакль ці кіно. Але трэба дакладна ведаць жыццё народа, яго звычаі, традыцыі, характар, каб пазнаць усе сакрэты, зашыфраваныя ў арнаментыцы мастацкіх вырабаў. Выхаванне сям’і праз народнае мастацкае ткацтва павінна стаць адным з прыярытэтных напрамкаў сучаснай сацыяльна-культурнай дзейнасці. Каб быць добрым чалавекам, сапраўдным беларусам, трэба ведаць традыцыі нашых продкаў, з павагай да іх адносіцца і выкарыстоўваць у сваім жыцці падобна абярэгу.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


*1.* Беларускі фальклор : энцыкл. – Мінск : Беларус. энцыклапедыя, 2006. – Т. 2.

*2.* Беларуская міфалогія : энцыкл. сл. / укл. І. Клімковіч. – Мінск : Беларусь, 2006.

*3. Кацар, М. С.* Беларускі арнамент. Ткацтва. Вышыўка / М. С. Кацар. – Мінск : Беларус. энцыкл. імя П. Броўкі, 2013.

*4. Крук, І. І.* Сімволіка беларускай народнай культуры / І. І. Крук. – Мінск : Ураджай, 2001.

*5. Ракава, Л. В.* Традыцыі сямейнага выхавання ў беларускай вёсцы / Л. В. Ракава. – Мінск : Ураджай, 2000.

*6. Сысоў, У. М.* З крыніц спрадвечных / У. М. Сысоў. – Мінск : Вышэйш. шк., 1997.

*7. Цітоў, В. С.* Этнаграфічная спадчына : Беларусь. Краіна і людзі / В. С. Цітоў. – Мінск : Беларусь, 1996.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ